**Адамовіч Я.К.**, *дацэнт*

# ВЫКАРЫСТАННЕ АСВЕТНІЦКАЙ ГУМАНІСТЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ СЫМОНА БУДНАГА І ВАСІЛЯ ЦЯПІНСКАГА Ў КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

На долю нашай беларускай зямлі выпала шчасце нарадзіць і ўзгадаваць такіх тытанаў сярэднявечча Еўропы, як Скарына, Гусоўскі, Вісліцкі, Будны, Цяпінскі і інш. Кожны з іх знаходзіцца ў полі зроку даследчыкаў, бо яны — наш беларускі генетычны фонд мінуўшчыны і нацыянальны фундамент будучыні. У рамках азначанай тэмы нам хочацца высветліць гуманістычныя настроі і дзейнасць Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага - самаадданых захавальнікаў і адраджэнцаў роднай для іх беларускай культуры ва ўмовах жорсткага прыгнёту і актыўнай паланізацыі Вялікага княства Літоўскага Каралеўствам Польскім пад шыльдаю Рэчы Паспалітай.

Гістарычна склалася так, што мы дрэнна ведаем і сваю асабістую генеалогію (у асноўным да трэцяга калена), і генеалогію знакамітых людзей нашага краю. А, як напісаў Цыцэрон, «хто не ведае таго, што дзеелася на свеце даўней, той заўсёды будзе рабом». Дакладных дакументальных звестак пра Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага мала.

На думку польскага даследчыка, Сымон Будны нарадзіўся ў 1530 г. у вёсцы Буда на Мазовіі. Тут дзейнічае аналогія: з маёнтка Цяпіна — В.Цяпінскі, з Полацка — С.Полацкі, з Астрогі — К.Астрожскі. Але на Мазовіі ёсць толькі адна вёска Буда, на Беларусі ж іх больш за дваццаць. У якой Будзе нарадзіўся Сымон, застаецца адкрытым для даследчыкаў і цяпер. Паходзіў Сымон з сям'і дробнага шляхціца. Ён закончыў факультэт свабодных мастацтваў Ягелонскага універсітэта ў Кракаве. Мяркуюць, што вучыўся ў Італіі і Швейцарыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Еўропе ён вядомы як гуманіст-асветнік, філосаф, гісторык, пісьменнік, паэт, педагог, прапаведнік, тэолаг і рэлігійны рэфарматар. Ён пастаянна займаўся самаадукацыяй, ведаў некалькі моў і карыстаўся імі ў навуковай і выдавецкай практыцы.

З 1558 г. Будны працаваў пратэстанцкім прапаведнікам, спачатку ў кальвіністаў у Вільні, Клецку, Нясвіжы пад апекаю князёў Радзівілаў (Мікалая Чорнага і Мікалая Рудога), а потым у антытрынітарыяў у Холхаве, Заслаўі, Лоску, Любчы пад апекаю Яна Кішкі. У 1562 г. у заснаванай ім Нясвіжскай друкарні выдаў на беларускай мове ў сааўтарстве з Крышкоўскім і Кавячынскім славуты «Катэхізіс». У межах сённяшняй Беларусі гэта была першая друкаваная кніжка на роднай мове. Усяго ім выдадзена 19 кніжак на беларускай, лацінскай, польскай, французскай мовах. Сярод іх «Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам», «Новы Запавет», «Аб асноўных артыкулах хрысціянскай веры», «Аб свецкай уладзе» і інш.

С.Будны шмат і вельмі плённа займаўся перакладчыцкай дзейнасцю. Ён правёў дэталёвы аналіз старажытнаяўрэйскага, грэчаскага, славянскага і лацінскага варыянтаў Бібліі і выявіў шмат разыходжанняў, памылак перапісчыкаў і скажэнняў тэкстаў перакладчыкамі. Ён прыйшоў да высновы, што душа чалавека памірае разам з яго целам, абвяргаў дактрыну траістасці Бога і лічыў Ісуса Хрыста звычайным чалавекам, таленавітым заснавальнікам і прапаведнікам новага веравызнання. Памёр Сымон Будны 13 снежня 1593 г. у Вішневе (цяпер вёска у Валожынскім раёне Мінскай вобласці) у доме шляхціца-пратэстанта Лявона Маклока.

Гуманізм Сымона Буднага праяўляўся ў шматлікіх яго даследаваннях, дзеяннях і палеміцы, асабліва па пытаннях тэалогіі. Ён бачыў і адзначаў неадпаведнасць ідэалаў каталіцкага касцёла і ўсходняй царквы і выступаў з крытыкай царкоўнай іерархіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Адстойваючы гуманістычныя ідэі свабоды духу, індывідуальнай годнасці чалавека, унікальнасці кожнай асобы, асветнік лічыў, што ўсякі вернік можа размаўляць з Богам без пасрэднікаў». Ён вельмі крытычна ставіўся да прэсвітэраў, паноў, «царкоўных старцаў» і дыяканаў. Не ўхваляў ён і манастырскае жыццё, і пустэльніцтва, і скітніцтва, бо аскетызм, як і прага да абагачэння, супярэчыць сутнасці сапраўднай Царквы. А «сапраўдная Хрысціянская Царква - гэта, паводле вучэння Буднага, збор верных, дзе няма начальнікаў і падначаленых, дзе пануе адзінства Духа і галоўнае месца займаюць настаўнікі ды пастыры», — пісаў І.В.Саверчанка. Але ён з горыччу заяўляў «пра сапсаванне нораваў і сярод многіх настаўнікаў», асабліва ж абураўся дзейнасцю ілжэпастыраў, лічачы іх не «соллю зямлі», а сляпымі, якія вядуць сваіх вучняў у бездань. Будны раіць уцякаць ад гэтакіх настаўнікаў.

Беларускі асветнік з гуманістычных пазіцый адстойваў ідэю прыватнай пропаведзі з правам кожнага хрысціяніна свабодна вучыць, калі ён адчувае такую здольнасць. «Каждый бо христианин маеть быти свыщенник». Цікавае яго стаўленне да тыраніі. «Наш абавязак,— адзначаў Будны,— калі тыранія адбываецца перад нашымі вачыма, не маўчаць. Належыць заклікаць пана не чыніць зло ды паўтарыць гэта некалькі разоў. А калі ён не прыслухаецца, то ў знак пратэсту пакінуць тырана і не есці ягонага хлеба. Той жа, хто змоўчыць тырану ці -- яшчэ горш — пачне спрыяць яму, будзе строга пакараны Богам».

Будны горача «абараняў свабоду думкі і слова ў Царкве». Ён абураўся жорсткасцю, бесцырымоннасцю цэнзуры, якая прыгнятала і прыніжала асобу, прыцясняла дух. Будны быў прыхільнікам разнастайнасці думак і лічыў гэта натуральнай з'явай, «бо ў часы Апосталаў ніхто не пратэставаў супраць розных меркаванняў адносна тых альбо іншых з'яў» (147).

У рэчышчы гуманістычных традыцый сярэднявечча Будны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лічыў «чалавецкае жыццё за найвышэйшую каштоўнасць Свету». Ён «паўстаў супраць звычаю фізічнага вынішчэння ідэйных праціўнікаў». Спаленне Яна Гуса за погляды, «жорсткая расправа над ім, паводле слоў Буднага, супярэчыць Божай навуцы, усёй хрысціянскай маралі». Выступаючы супраць усялякіх крайнасцей, залішняй ідэйнай нецярпімасці і радыкалізму, ён раіў заўсёды кіравацца «прынцыпам залатой сярэдзіны». І прыемнае, і непрыемнае не раіў безаглядна прымаць ці з трэскам адкідваць. Гэтаксама не трэба адхіляць новага, не ўзважыўшы яго як след, бо Святы Дух праз Апостала прама сказаў: «Дух не тушыце. Прароцтва не знішчайце. Усё выпрабоўвайце, трымайцеся лепшага». Ён хацеў, каб і Царква стаяла на гуманістычных пазіцыях і несла людзям згоду і мір. Яна павінна быць такім месцам, дзе людзі «маглі б паразумецца, убачыць сваё адзінства, з'яднацца ў пераадоленні цяжкасцей, адчуць прыгажосць жыцця і гармонію Свету, напоўніцца жыццядайнай хрысціянскай радасцю».

У тэалагічных пошуках Буднага шмат цікавых назіранняў і выказванняў гуманістычнага накірунку. Ён своеасабліва разглядаў Святыя тайны, дадзеныя Богам як сродак збаўлення. Але з усіх царкоўных цырымоній да тайнаў адносіў толькі Святое Хрышчэнне і Вячэру Гасподню. Астатнія лічыў практычнымі жыццёвымі з'явамі. Напрыклад, сцвярджаў, што «жаніцьба ўчынена Богам не як тайна, а для трох рэчаў: каб чалавек не быў адзін на Зямлі, каб не знік людскі род і дзеля папярэджання блуду».

Гуманістычным зместам напоўнена яго эстэтычная дактрына: ідэал асобы і грамадства. Развіваючы вучэнне пра найвышэйшы маральны закон, дадзены Богам, Будны падрабязна аналізаваў кожную запаведзь, даваў свае тлумачэнні і парады. Ён прыходзіў да гуманістычных высноў і сцвярджэнняў па пытаннях «пашаны сваіх бацькоў і наогул усіх старэйшых», а таксама сваіх настаўнікаў, пастыраў, начальнікаў. Ён быў супраць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самасуду ў пытаннях пакарання і забойства. Гуманіст лічыў, што забіць можна і словам, і крытыкаваў масавыя забойствы, усялякія войны, асабліва асуджаючы «праліццё хрысціянскай крыві». Але ён прызнаваў справядлівыя войны, што былі накіраваны на абарону радзімы. Будны асуджаў пралюбадзействы, лічыў злад-зейства найвялікшым святатацтвам, хлусню — блюзнерствам, «даводзячы, што толькі праўда дасць мажлівасць выратавацца».

Па пытаннях сацыяльнай справядлівасці і грамадскай гармоніі Будны выказаў цікавыя думкі адносна ідэі беларускіх аскетаў-камуністаў дзяліць дабро багатых паміж жабракамі і прыйсці да ўсяго агульнага. Цікавыя яго доказныя спрэчкі з Якубам з Калінаўкі адносна гаспадароў і падданых. Яго хвалявалі пытанні ўлады, ролі ўрада. І хоць у палеміцы з анархістамі за памяркоўнасць сваіх сацыяльна-палітычных дактрын Сымон Будны быў адлучаны ад Сабору ў канцы 80-х гадоў XVI ст., але гэта не было паражэннем, бо многія прынцыпы, якіх трымаўся Будны, увайшлі юрыдычнымі нормамі ў новы Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.

Магчыма, трэба было пачынаць з таго, што Будны горача змагаўся за развіццё беларускай мовы і беларускай культуры. У прадмове да «Катэхізіса» ён са сваімі сааўтарамі настойліва пераконваў маладых князёў Радзівілаў не шкадаваць сіл і сродкаў на развіццё беларускай культуры, падтрымліваць веліч «здаўна слаўнай беларускай мовы», клапаціцца пра асвету народа. У прысвячэнні маладым князям Будны выказвае сваю радасць, што ў Нясвіжскай друкарні пачалі друкавацца кнігі для беларускага народа на яго роднай мове, і заклікае князёў падаваць прыклад у гэтай важнай нацыянальнай справе (як некалі гэта рабілі іх бацькі і продкі). Адчуваючы ўціск паланізацыі, «Будны з горыччу падкрэсліваў, што недарэчным глупствам з'яўляецца тэндэнцыя пагарджаць мовай адной краіны, каб узнесці да нябёс мову другога народа».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Але першую скрыпку ў нацыянальных пытаннях адыграў яго паплечнік і блізкі сябра Васіль Цяпінскі (1540-1604). Ён прымаў удзел у Лівонскай вайне, быў членам секты антытрынітарыяў, але яго сацыяльныя погляды насілі памяркоўны характар. Ён падзяляў войны на справядлівыя (абарончыя) і несправядлівыя (захопніцкія), прызнаваў прымяненне зброі ў якасці абароны. Як асветнік і вялікі патрыёт сваёй радзімы Цяпінскі імкнуўся пашырыць асвету сярод простага люду. Ён стварыў перасоўную друкарню, пераклаў «Евангелле» на беларускую мову і выдаў яго для школьных патрэб. У публіцыстычнай прадмове да гэтай кнігі Цяпінскі ў духу гуманізму выказваў свае рэлігійныя перакананні, грамадскія погляды і нацыянальныя пачуцці. Ён захапляўся гістарычным мінулым роднага краю, абураўся бяздзейнасцю духавенства і свецкіх феадалаў у справе развіцця нацыянальнай культуры. Ён лічыў, што мова беларускага народа мае ўсе падставы для таго, каб ёю ганарыцца і шырэй выкарыстоўваць у кнігах Свяшчэннага Пісання.

Як асветнік-гуманіст Цяпінскі шырока абгрунтаваў і развіў думку пра значэнне асветы на роднай мове. Ён пераканаўча і смела паставіў пытанне пра арганізацыю нацыянальных школ для простага люду, увёў у актыўны слоўнікавы склад беларускай літаратурнай мовы шмат новых слоў з мясцовай лексікі. Цяпінскі ўзняўся да разумення абуджэння нацыянальнай самасвядомасці праз адукацыю. «А был бы готов, если она (бацькаўшчына) до конца згинет, з нею згинуть, або если... будет выдвигнена... з нею вывринуть»,— заяўляе ён у сваёй прадмове. І ўсё ж, нягледзячы на жорсткую паланізацыю, верыў у светлую будучыню роднага краю. На жаль, нам і сёння гэтай веры не хапае.

Падсумоўваючы творчую дзейнасць гэтых тытанаў беларускага сярэднявечча, трэба адзначыць іх заклапочанасць пра развіццё культуры роднага краю, іх упартасць і самаадданасць на ніве захавання мясцовых традыцый культурнага, мастацкага і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школьнага развіцця, іх гуманізм да «люду простага паспалітага». Дзякуючы С.Буднаму і В.Цяпінскаму, рэфармацыйна-рэлігійныя плыні і брацкі рух на землях Велікага княства Літоўскага станавіліся на пазіцыі развіцця ідэй рэнесансных гуманістычных традыцый, якія ў пэўнай ступені жывуць і сёння ў нацыянальнай беларускай асветніцкай і мастацкай справе.

**Майсеенка А.Ф.**, *дацэнт*

## ДУХОЎНА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ЯНКІ НЁМАНСКАГА Ў КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Янка Нёманскі прыйшоў у літаратуру ў 20-я гады, якія вызначаліся зменамі, што наступілі пасля бальшавіцкага перавароту ў кастрычніку 1917 года і усталявання савецкай улады ў Беларусі пасля грамадзянскай вайны. Новы гістарычны этап аказаўся напоўненым новымі складанасцямі, часта зусім нечаканымі для тых, хто мужна пераносіў цяжкасці рэвалюцыйнага разлому.

Маладая пісьменніцкая генерацыя, да якой належаў і Янка Нёманскі, павінна была асэнсаваць характар грамадскіх змен, што адбываліся ў краіне, набыць сваю філасофію, эстэтыку, стварыць мастацтва, якое адказвала б на праблемы сучаснасці. Сацыяльны змест, сацыяльны фактар быў вылучаны ў цэнтр усяго літаратура-грамадскага працэсу ў 20-я гады, і гэта давала адчувальны імпульс для працы Янкі Нёманскага перш за ўсё ў жанры апавядання.

Янка Нёманскі, як і Кузьма Чорны, Міхась Зарэцкі, Міхась Лынькоў і інш., не быў толькі (ці нават пераважна) апавядальнікам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ